# АДПАЧЫНАК ДЗЯЦЕЙ: СУТНАСЦЬ І ЗМЕСТ

*В. Л. Жук,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт БДУ*

*Працяглы час сістэма арганізацыі летняга адпачынку дзяцей і падлеткаў была закрытай, аўтарытарнай, аднаварыянтнай, г. зн. бесперспектыўнай з-за кансерватыўнасці зместу і арганізацыйных формаў. Дзейнасць, узаемаадносіны педагогаў і выхаванцаў характарызаваліся заарганізаванасцю, муштрой, недарэчнымі забаронамі і абмежаваннямі, якія зневажалі годнасць асобы.*

Крызісны стан сістэмы летняга адпачынку дзяцей тлумачыцца шэрагам сацыяльных, эканамічных, арганізацыйна-кіраўніцкіх і псіхолага-педагагічных прычын. Сацыяльныя прычыны вызначаюцца: утылітарнымі адносінамі да дзяцінства; усеагульнай недаацэнкай значэння дзяцінства як перспектывы інтэлектуальнага, творчага развіцця грамадства; адсутнасцю заканадаўчай базы па абароне і гарантыях правоў дзіцяці. Астаткавае фінансаванне сістэмы арганізаванага летняга адпачынку дзяцей таксама пагоршыла яго становішча. Акрамя таго, у апошні час педагогіка развівалася як нарматыўная навука, і тэорыі, што ўзнікалі ў яе рамках (у тым ліку сістэма арганізаванага адпачынку дзяцей), мелі яскравую імператыўную адметнасць. Рэпрадуктыўны характар педагогікі вызначыўся менавіта дзякуючы сацыяцэнтрычнай сістэме кіравання грамадствам, якая патрабавала выхоўваць законапаслухмяных выканаўцаў. Палажэнні аўтарытарна-рэпрадуктыўнай педагогікі не адпавядаюць агульначалавечым, гуманістычным прынцыпам свабоднага развіцця асобы, яе самавызначэнню і самарэалізацыі.

Сёння, калі фарміруецца новае педагагічнае мысленне, распрацоўваюцца палажэнні сацыяльнай педагогікі (гуманнай, адкрытай, шматфункцыянальнай), паўстала праблема выпрацоўкі канцэптуальных асноў рэарганізацыі сістэмы развіваючага летняга адпачынку дзяцей. Апорнай ідэяй абнаўлення гэтай сістэмы з'яўляецца ідэя гуманізацыі жыцця, а менавіта: зварот да асобы дзіцяці, яго інтарэсаў, узроставых і індывідуальных патрэб, клопат пра яго здароўе і развіццё здольнасцей і талентаў.

Канцэпцыя развіваючага адпачынку дзяцей можа будавацца на аснове наступных прынцыпаў:

1. **Гуманныя, беражлівыя адносіны да дзіцяці.** Гэты прынцып прадугледжвае, што грамадства ў адпаведнасці з Канвенцыяй ААН аб правах дзіцяці дасць

яму неабходныя сацыяльныя, прававыя, прафесіііна-кадравыя, матэрыяльныя ўмовы для паўнацэннага і цікавага правядзення канікул, створыць сістэму гарантыі, калі кожнае дзіця зможа рэалізаваць свої статус раўнапраўнага суб'екта грамадскіх адносін. Акрамя таго, названы прынцып азначае, што педагог зможа наладзіць гуманныя, сатворчыя, развіваючыя адносіны з дзіцем — адносіны раўнапраўных партнёраў у працэсе сумеснаі творчаі дзейнасці. Ажыццяўленне гэтага прынцыпу прадугледжвае канкрэтныя правы дзіцяці — права на памылку, права задаваць любыя пытанні, права свабоднага выказвання ўласнаі думкі.

2. **Прызнанне самакаштоўнасці дзіцяці і прыярытэту яго асобасных інтарэсаў над групавымі.** Гэта азначае, што дзіця — цэнтральнае звяно ў сістэме арганізаванага адпачынку ў перыяд летніх канікул.

3. **Развіваючы характар жыццядзейнасці дзяцей.** Гэты прынцып рэалізуецца ў рамках дзейнаснага падыходу да фарміравання асобы і прадугледжвае стварэнне неабходных умоў для інтэлектуальнага, фізічнага, маральнага, творчага і г. д. развіцця дзіцяці. Іншымі словамі, указаны прынцып арыентуе педагогаў на раскрыццё і развіццё унікальнасці кожнага дзіцяці, актуалізацыю яго здольнасцеі і талентаў. Дамінантаі гэтага прынцыпу з'яўляюцца адносіны да асобы дзіцяці як суб'екта дзейнасці.

4. **Адпаведнасць дзейнасці патрэбам, інтарэсам асобы дзіцяці.** Рэалізацыя гэтага прынцыпу азначае добраахвотнае ўключэнне дзяцей у асобасна значныя віды дзейнасці і мастацтва з улікам іх магчымасцеі, патрэб, інтарэсаў.

5. **Свабода выбару дзецьмі і іх бацькамі формаў і зместу правядзення летніх канікул.** Гэты прынцып прадугледжвае варыятыўнасць сістэм развіваючага адпачынку дзяцей.

Зробім псіхолага-педагагічнае ўдакладненне некаторых паняццяў, якія выкарыстоўваюцца пры апісанні сістэмы летняга адпачынку дзяцей.

Вядома, што адпачынак — гэта стан спакою або такі род дзейнасці, якая знімае стомленасць і садзейнічае ўзнаўленню працаздольнасці*. У паняцце "адпачынак" (як педагагічны тэрмін) намі ўкладваецца наступны сэнс. **Адпачынак — гэта дзейнасць (гульнявая, займальная, працоўная, камунікатыўная), якая:**

*здымае ў дзяцей назапашаную за год эмацыянальную і інтэлектуальную напружанасць, узнаўляе фізічныя і духоўныя сілы, умацоўвае здароўе;*

*садзейнічае інтэлектуальнаму развіццю дзяцей;*

*задавальняе і рэалізуе індывідуальныя патрэбы і інтарэсы;*

*прадугледжвае свабоду ў выбары заняткаў і добраахвотнасць удзелу ў іх;*

*з'яўляецца сумеснай для дзяцей і дарослых творчасцю.*

Пад тэрмінам "летнія канікулы" маецца на ўвазе час (прыкладна 1/4 года), свабодны ад вучобы школьнікаў.

Традыцыйна развіццё дзяцей у піянерскіх лагерах ацэньвалася з дапамогай, галоўным чынам, колькасных, а не якасных паказчыкаў — у выглядзе прыбаўкі вагі дзіцяці, колькасці спаборніцтваў, выхаваўчых мерапрыемстваў. Галоўнымі задачамі ў арганізацыі традыцыйнага адпачынку з'яўляліся: забеспячэнне харчаваннем, прагулкі, аздараўленчы сон; строгае выкананне рэжыму дня.

* Сов. энциклопед. словарь / Гл. редактор Прохоров А. М. — М., 1987. — С. 948.

праблемы інтэлектуальнага развіцця асобы, фарміравання і ўмацавання пазнавальнага інтарэсу былі на другім плане. Сёння з'явілася неабходнасць распрацаваць развіваючыя праграмы для дзяцей у перыяд летніх канікул. Мэта такіх праграм — не толькі фізічнае аздараўленне дзяцей, але і іх разняволенне; наладжванне добраахвотных заняткаў творчасцю; фарміраванне цікаўнасці, патрэбы ў пазнанні сябе і навакольнага свету; замацаванне і развіццё дасягнутых вынікаў у вучобе, мастацтве, спорце з улікам магчымасцей і жаданняў кожнага дзіцяці; падтрымка адораных дзяцей.

На аснове гэтых разважанняў лагічна вызначыць тэрмін "развіваючы адпачынак". **Гэта адпачынак дзяцей і падлеткаў, які арганізаваны і праводзіцца ў канікулярны час ва ўмовах аздараўленчых цэнтраў у адпаведнасці з праграмамі ўсебаковага развіцця асобы дзіцяці і яго адаптацыі ў соцыуме.** Пад сістэмай развіваючага адпачынку дзяцей мы маем на ўвазе сукупнасць кампанентаў, якія знаходзяцца ў пэўных узаемасувязях:

1) асоба дзіцяці;

2) забеспячэнне: матэрыяльна-тэхнічнае, нарматыўна-прававое, арганізацыйна-кіраўніцкае;

3) змест, формы і метады арганізацыі развіваючага адпачынку дзяцей (псіхолага-педагагічны кампанент);

4) педагагічныя кадры: формы, метады і сродкі падрыхтоўкі.

1. Арганізуючым фактарам сістэмы развіваючага адпачынку дзяцей з'яўляецца асоба дзіцяці, далучаная да індывідуальных і калектыўных відаў дзейнасці, і сацыяльныя адносіны, накіраваныя на яе развіццё.

Асоба дзіцяці будзе сапраўды з'яўляцца галоўным звяном у сістэме адпачынку, калі:

спалучаюцца развіццё самадзейных асноў і ініцыятывы падлеткаў і дзейнасць педагогаў;

выкарыстоўваецца сацыяльнае і прыроднае асяроддзе для духоўнага і фізічнага развіцця дзяцей;

рэалізуецца агульны клопат дарослых і дзяцей аб эмацыянальна-маральным клімаце: дружба, давер, радасць узаемаадносін і сатворчасць, свабода выбару відаў дзейнасці;

адпачынак арганізуецца ў гнуткіх структурах (клуб па інтарэсах, рознаўзроставы калектыў і г. д.) і рэжыме дня ў адпаведнасці з узростам дзяцей.

2. Функцыяніраванне сістэмы дзіцячага адпачынку ва ўмовах аздараўленчых цэнтраў, лагераў звязана з матэрыяльна-эканамічным, нарматыўна-прававым, арганізацыйна-кіраўніцкім аспектамі забеспячэння. Відавочна, што ступень матэрыяльнай аснашчанасці залежыць ад аб'ёмаў фінансавання з боку дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый і фондаў, прыватных або кааператыўных прадпрыемстваў і г. д. У апошні час шмат дзіцячых цэнтраў спынілі сваё існаванне з-за слабага фінансавання. Практыка падказала выхад: перавесці дзіцячыя цэнтры, лагеры на гасразлік, г. зн. прадаставіць ім эканамічную самастойнасць. У гэтых умовах актуальным уяўляецца стварэнне ў дзіцячым цэнтры аддзела па распрацоўцы і вытворчасці зборна-разборных мадэляў, рэквізіту, дэкарацый, касцюмаў, спортінвентару і г. д. Удзел дзяцей разам з дарослымі ў распрацоўцы чарцяжоў, праектаў, мадэляў ператвараецца ў сапраўдную стваральную творчасць, у працэсе якой развіваецца асоба дзіцяці.

Нарматыўна-прававы аспект уключае ў сябе комплекс стандартаў і палажэнняў па арганізацыі і нарміраванні дзейнасці дзіцячага цэнтра. Акту-

альнаї і нявырашанаї застаецца праблема нарміравання працы педагога, выхаваццеля, важатага ва ўмовах летняга дзіцячага цэнтра, а таксама задача распрацоўкі адпаведнаї заканадаўчаї базы.

Арганізацыйна-кіраўніцкі аспект забяспечвае рэгуляванне сістэмы летняга адпачынку дзяцей з дапамогаї пэўных структур (напрыклад, базавага прадпрыемства або грамадскага фонду, які выступае спонсарам, і г. д.) і адпаведнага кіраўніцкага апарату (савет педагогаў, выхаваццеляў, важатых, савет дзіцячага летняга цэнтра, кафедра педагагічнага інстытута і г. д.).

3. Змест сістэмы летняга адпачынку дзяцей і падлеткаў вызначаецца агульначалавечымі, гуманістычнымі каштоўнасцямі і дасягненнямі сусветнаї цывілізацыі ў сферы мастацтва, рэлігіі, навукі, тэхнікі, адукацыі, інфармацыі, а таксама нацыянальнымі традыцыямі і рэгіянальнаї спецыфікаї. У схеме (гл. с. 34 — 35) прадстаўлена канкрэтная праграма па арганізацыі і правядзенні развіваючага адпачынку дзяцей. Так, дзіця на добраахвотнаї аснове ўключаецца ў асобасна значныя віды індывідуальнаї і калектыўнаї дзейнасці: пазнавальныя гульні-святы, калектыўныя творчыя справы і г.д. Прычым змест гэтай дзейнасці павінен адпавядаць наступным патрабаванням: сацыяльная і асобасная значнасць, гуманнасць, творчасць, добраахвотнасць, сумесны характар працы, радасць пазнання і ўзаемаадносін. Акрамя таго, дзейнасць вызначае асобу, спрыяе яе развіццю. У схеме выдзелены напрамкі інтэлектуальнага развіцця асобы дзіцяці (самакіраванне, сакратаўскія гутаркі, мазгавы штурм, гульні, святы і г. д.) і інтэграцыйныя асобасныя якасці, фарміраванне якіх з'яўляецца і мэтаї развіцця асобы, і вынікам рэалізацыі апісанаї праграмы. І далей, абагульненым вынікам уключэння дзіцяці ў сістэму развіваючага адпачынку з'яўляецца фарміраванне эмоцыі, пазнавальных інтарэсаў — матывацыі да вучобы, пазнання сябе і навакольнага соцыума, дзейнасці і творчасці. Акрамя таго, у верхняї частцы схемы выдзелены сацыяльна-педагагічныя праблемы летніх канікул, вызначаны іх функцыі: педагагічная, прававая, сацыякультурная.

Сэнс першаї функцыі заключаецца ў тым, што грамадства, сям'я ствараюць адпаведныя ўмовы для эмацыянальнага, інтэлектуальнага, валявога, фізічнага развіцця асобы дзіцяці за кошт актывізацыі дарослымі гульнявога, імправізацыйнага, творчага, самакіраўнічага пачаткаў у іх жыццядзейнасці.

Другая (прававая) функцыя — гарант абароны правоў і свабод асобы дзіцяці. Яна з'яўляецца сродкам утрымання дзяцей ад правапарушэнняў, выхавання "цяжкіх". Сацыякультурная функцыя вызначае сферу рэалізацыі патрэб дзяцей ва ўласным развіцці і далучэнні іх да свету сацыяльна-чалавечых адносін, у тым ліку да культурных, маральных каштоўнасцей. Яна ажыццяўляе сувязь паміж асобай дзіцяці і навакольным асяроддзем. Рэалізацыя ўсіх названых функцыі забяспечвае неабходныя ўмовы для ўсебаковага развіцця асобы дзіцяці ў соцыуме. Відавочна, што апошняе і з'яўляецца задачаї сацыяльнаї педагогікі.

4. Праграма і формы падрыхтоўкі педагагічных кадраў для работы з дзецьмі ў перыяд летніх канікул распрацаваны і апрабіруюцца ў навукова-эксперыментальным цэнтры "Летнік".

Інтэграваныя формы, метады і прыёмы падрыхтоўкі педагогаў уключаюць: сакратаўскія гутаркі, цыкл праблемных лекцый, семінары, відэатрэнаж, арганізацыйна-дзейнасныя гульні, педагагічную практыку на эксперыментальных пляцоўках, канферэнцыю аўтарскіх ідэй, абарону дыпломных праектаў. Структура фрагмента праграмы падрыхтоўкі выхаваццеляў, важатых для работы з дзецьмі ва ўмовах аздараўленчага цэнтра, лагера ў перыяд летніх канікул пададзена на 39-ай старонцы.

## Структура фрагмента праграмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў

### Лагерная змена: хроніка аднаго дня

### Дзень першы: заезд дзяцей

**Аспекты:**

а) арганізацыйныя, б) псіхалагічныя, в) педагагічныя, г) кіраўніцкія.

1. Сустрэча, размяшчэнне, першыя гадзіны ў калектыве.
2. Пад'ём, снеданне, абед, ціхая гадзіна, вячэра: традыцыі, праблемы, матывацыя.
3. Вольны час, гульнявое тэстыраванне, рэалізацыя індывідуальнага падыходу да кожнага дзіцяці.
4. Атрадны касцёр: знаёмства, любімыя песні пад гітару, цікавыя здарэнні, Я – Асоба.
5. Рэфлексія па выніках першага дня: а) з дзецьмі, б) з педагогамі і важатымі. Чаканне вынікаў.

### Дзень другі: інварыянт з пазіцый інтэлектуальнага развіцця

**Аспекты:**

а) змест рэжымных момантаў, б) метадычныя рэкамендацыі па яго правядзенні, в) метадычнае забеспячэнне, г) улік індывідуальнасці Я-дзіцяці, д) праблемы камунікацыі ў калектыве, е) педагогіка супрацоўніцтва, ж) псіхалагічны камфорт і радасць душы дзіцяці, з) размовы шэптам.

1. За гадзіну да пад'ёму дзяцей. Што раблю Я-важаты?
2. Рэжымныя моманты. Пад'ём: праблемы, улік індывідуальнасці кожнага дзіцяці.
3. Зарадка: матывацыя, добры настрой, прыгожая форма.
4. Асабістая гігіена, самасузіранне, планы на дзень.
5. Снеданне: культура харчавання, этыкет, самаабслугоўванне.
6. Чысціня вакол: працоўны дэсант.
7. Атрадныя справы, вольны час і асабістыя справы.
8. Абед, ціхая гадзіна, полудзень: што? як? нашто?
9. Атрадныя справы: спорт, гульні, мастацтва.
10. Вольны час: чытанне, самасузіранне, пісьмы бацькам і сябрам, адасабленне.
11. Вячэра: прыемнага апетыту, этыкет, культура харчавання.
12. Агульныя мерапрыемствы: зборы, фестывалі, гульні-святы, спаборніцтвы, конкурсы, дыскатэкі.
13. Рэфлексія дня: а) з дзецьмі, б) з важатымі.
14. Адбой: аўтатрэнінг, санітарная гігіена, музыка, якая супакойвае, казкі.
15. Вячэрняе дзяжурства: што рабіць важатым у першую гадзіну пасля адбою?

Праграма падрыхтоўкі педагагічных кадраў для работы з дзецьмі ў летніх аздараўленчых цэнтрах выяўляе асобасны падыход да прафесійнай падрыхтоўкі. **Цэнтральным звяном у апісанай структуры з'яўляюцца не формы і метады і нават не змест навучання педагогаў, а асоба дзіцяці, якая развіваецца ў працэсе мэтазгоднай дзейнасці і ўзаемадзеяння.** Для таго каб выхавацель або важаты змог пабудаваць педагагічна мэтазгодную сумесную дзейнасць у адносінах з дзецьмі, яму неабходна ведаць не толькі змест гульняў і

## Структурна-лагічная схема праграмы развіцця асобы (у летніх аздараўленчых цэнтрах)

Адзіны свет
Грамадства
Сям'я

Дзяўчынка
Дачка
Унучка
Будучая мама

Хлопчык
Сын
Унук
Будучы бацька

**Сацыяльна-педагагічныя праблемы летніх канікул**
**Вольны час дзяцей:**

**Праблемы сям'і і грамадства**

**Папярэджанне правапарушэнняў**

**Адпачынак і развіццё**

**Функцыі летніх канікул:**
**Педагагічная** **Прававая** **Сацыякультурная**

### Формы індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці дзяцей

**Дзейнасць:**
**значная, гуманная, творчая, добраахвотная, сумесная, радасная**

**Падрыхтоўка да гульняў-святаў, фестываляў, конкурсаў, карнавалаў, спаборніцтваў**

**Пазнавальная гульня-свята (ПГС) як сродак развіцця пазнавальных інтарэсаў**

**Калектыўныя творчыя справы (КТС)**

**Скаўцкія атрады**

**Спартыўныя спаборніцтвы**

**Конкурсы: шумавых аркестраў, самадзейнай песні, архітэктараў, інсцэніраванай казкі**

**Віктарыны**

**Працоўныя справы**

**Клубы па інтарэсах**

**Масавыя гульні**

**Прагляд тэлеперадач, відэафільмаў, спектакляў**

**Працяг табліцы гл. па наступнай старонцы**




методыку правядзення фестываляў, спаборніцтваў, гульняў-святаў, але і хроніку (структуру, змест) дня з пазіцын псіхалагічнага камфорту дзіцяці і яго інтэлектуальнага развіцця. Праграма набывае комплексны характар, а формы навучання становяцца інтэграцыйнымі.

Усе разгледжаныя кампаненты апісанай сістэмы развіваючага адпачынку дзяцей (1. асоба дзіцяці, 2. забеспячэнне, 3. змест, формы і метады арганізацыі развіваючага адпачынку дзяцей, 4. педагагічныя кадры: формы, метады і сродкі

падрыхтоўкі) цесна ўвязаны паміж сабой. Неадэкватнае агульным канцэптуальным асновам функцыяніраванне аднаго з кампанентаў можа парушыць тую або іншую функцыю летніх канікул, а значыць, прывядзе да крызіснага стану і ўсю сістэму.

Намі распрацавана, навукова абгрунтавана і апрабіравана інавацыйная форма арганізацыі пазаўрочнай дзейнасці дзяцей — пазнавальная гульня-свята (ПГС). ПГС — гэта: 1) форма арганізацыі і наладжвання дзейнасці дзяцей у летні перыяд ва ўмовах аздараўленчага цэнтра, дзіцячага лагера; 2) сродак развіцця пазнавальных інтарэсаў дзяцей.

ПГС рэалізуе наступныя функцыі:

1) сацыяльную — дапамагае дзіцяці ўвайсці ў кантакт з соцыумам, адчуваць сябе камфортна ў новых умовах, асэнсаваць сваю значнасць (ПГС — элемент сацыяльнай педагогікі);

2) развіваючую — забяспечвае фарміраванне ў дзіцяці матывацыі да пазнання сябе і навакольнага свету, вучобы (праз ПГС да навучальных прадметаў);

3) дзейнасную — уключае дзіця ў такія віды дзейнасці, як распрацоўка сцэнарыяў, разыгрыванне роляў, харэаграфія, выраб касцюмаў, дэкарацый, рэквізітаў і г. д. (праз ПГС да творчай, працоўнай, захапляючай дзейнасці, а ад яе — да развіцця асобы).

ПГСы маюць дастаткова шырокую тэматыку: “Чалавек і мора”, “Тайны марской бездані”, “Касмічная феерыя”, “Тайны сусвету”, “Матэматыка — мова прыроды”, “Хімія і жыццё”, “Свята рэспублікі”, “Спіраль вечнасці”.

Указаныя гульні-святы забяспечваюць цэласнае фарміраванне светапогляду дзяцей, ствараюць матывацыю да пазнання.

Такім чынам, сутнасць апісанага падыходу да сістэмы развіваючага летняга адпачынку — стварэнне ўмоў для:

а) уключэння дзяцей у творча развіваючую дзейнасць;

б) задавальнення кожным дзіцем асабістых патрэб і інтарэсаў;

в) разумення ўласнай самакаштоўнасці, асэнсавання сваёй ролі ў соцыуме;

г) інтэлектуальнага развіцця.

Рэалізацыя такога падыходу патрабуе псіхалагічнай перабудовы свету дарослых — абвяшчэння самакаштоўнасці дзяцінства, прызнання прыярытэтнасці правоў, інтарэсаў, жаданняў дзяцей.

*O.Zhuk's article deals with the problems of children's rest during summer holidays. An attempt to work out some conceptual principles for renewal of system of Children's summer rest is undertaken. Structural—logical scheme of programme of child's intellectual development in conditions of improving health center is given. Some concrete problems on training of pedagogical staff for the work with children are elucidated.*